ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
І.Г.Лашкевіч
_____ 2022 г.

# ЗАДАННІ
для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд
па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)"

Дата правядзення: 30 сакавіка 2022 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 11.40 (45 хвілін, 10 хвілін перапынак, 45 хвілін).

## IVклас

1. Прачытай тэкст.

Замкі Беларусі

Замкі Беларусі – гэта культурны і гістарычны нацыянальны скарб. Шмат старонак нашай гісторыі звязана з імі.

Калісьці замкі выступалі сапраўднымі абаронцамі беларускай зямлі. Кожны з іх перакрываў шлях ахвотнікам заваяваць нашы прасторы, зняволіць нашых людзей. Раней зямля не лічылася захопленай, пакуль не быў узяты замак, пакуль абараняліся яго насельнікі.

Нават рэшткі старажытных замкаў і крэпасцяў здзіўляюць сваёй магутнасцю і веліччу. А ў даўніну гэта былі цудоўныя архітэктурныя ансамблі.

*Паводле А.Бутэвіча*

2. Ці адпавядаюць прапанаваныя выказванні зместу тэксту?

| Выказванне | Так (+) | Не (-) |
|---|---|---|
| 1. Замкі Беларусі – гэта культурны і гістарычны нацыянальны скарб. | | |
| 2. Старадаўнія замкі ўжо страцілі свой велічны і магутны выгляд. | | |
| 3. Старадаўнія замкі былі таксама радавымі гнёздамі беларускіх магнатаў. | | |
| 4. Калісьці замкі выступалі сапраўднымі абаронцамі беларускай зямлі. | | |

3. Складзі і запішы 3 (тры) пытанні, абапіраючыся на тэкст.

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

4. Пра што гэты тэкст? Сфармулюй адказ адным сказам.

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

5. Якія члены сказа можна вызначыць у 3 (трэцім), 6 (шостым) сказе тэксту? Адзнач.

А) Дзейнік і даданыя члены
Б) Выказнік і даданыя члены
В) Дзейнік і выказнік
Г) Даданыя члены
Д) Дзейнік і выказнік, даданыя члены

3 _____; 6 _____.

6. Выпішы з тэксту 5 (пяць) слоў, у якіх колькасць літар і гукаў не супадае.

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

7. Выпішы з тэксту да кожнай схемы па аднаму слову.



______________________________________________________________________

8. Палічы ў першым абзацы тэксту колькасць назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў. Разгледзь групы дыяграм. Адзнач адну групу, якая адпавядае колькасці знойдзенных назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў.




9. Падбяры з тэксту словы, якія падыходзяць да прыведзеных лексічных значэнняў.

Стройнае спалучэнне частак у адно цэлае – ______________________.
Што-небудзь дарагое; каштоўнасці – ______________________.

10. Працягні рады слоў-сінонімаў, выкарыстоўваючы словы з тэксту.

Выдатныя, адмысловыя, незвычайныя, ____________________ .
Грандыёзнасць, значнасць, ____________________ .
Шаша, дарога, ________________ .
Пакарыць, захапіць, __________________.